## ПЕДАГАГІЧНЫ АСПЕКТ ПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКАЎ АБСЛУГОВАЙ ПРАЦЫ

В.С. Болбас
(Мазырскі педагагічны інстытут)

Перабудоўчыя працэсы, якія адбываюцца ва ўсіх сферах жыцця, патрабуюць адпаведных змен і ў падрыхтоўцы кваліфікаваных педагагічных кадраў. У сувязі з гэтым істотнаму перагляду павінна быць падвержана выкладанне ўсяго цыклу педагагічных дысцыплін. Пры гэтым такі перагляд павінен быць скіраваны як на змест, так і на тэхналогію выкладання вывучаемых прадметаў.

Маючы на ўвазе шматфактарны характар фарміравання чалавечай асобы, педагагічная тэорыя і практыка павінныпадыходзіць да выхавання індывіда ў цэласным адзінстве. У сувязі з гэтым педагогіка можа і павінна выконваць інтэгратыўныя функцыі складаемых кампанентаў у падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Кафедрай педагогікі Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута назапашаны пэўны вопыт арганізацыі работы ў азначаным кірунку.

Улічваючы спецыфіку факультэта, выкладчыкі педагагічных дысцыплін вялікую ўвагу надаюць пытанням вывучэння арганізацыі навучання ў спалучэнні з прадукцыйнай працай, працоўнаму выхаванню, гісторыі развіцця політэхнічнай адукацыі і т.д. Выпускнікі факультэта павінны мець асаблівую падрыхтоўку ў рабоце з дзяўчынкамі — асноўным будучым кантынгентам іх навучэнцаў. У сувязі з гэтым вялікая ўвага звяртаецца на вывучэнне псіхалагічных асаблівасцей школьніц, гісторыю арганізацыі жаночай адукацыі, полаўзроставыя адрозненні пры фарміраванні асобы.

Значныя магчымасці павышэння ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі маюцца на шляху вывучэння і выкарыстання этнапедагагічных ідэй беларускага народа. Агульнавядома, што народна-выхаваўчыя ідэі і практычны вопыт беларусаў грунтуецщана педагогіцы працы, якая вызначала і працягвае вызначаць і заразусе напрамкі грамадскага ўладкавання. Актуальнасць такогападыходу абумоўлена, з аднаго боку, пытаннем пабудовы нацыянальнай школы, што ўвогуле павінна актывізаваць накірункі збліжэння педагагічнай навукі з этнічнай педагогікай беларусаў, а з другога — відавочным падабенствам мэт і задач народнага выхавання і



сучасных урокаў абслуговай працы ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе. Згадаем, што народная педагогіка мела на мэце, у прыватнасці, выхаванне дзяўчынак у якасці будучых гаспадынь і маці. Зыходзячы з гуманістычнай парадыгмы развіцця адукацыі ў рэспубліцы, суб'ект-аб'ектныя адносіны зараз актыўна замяняюцца на суб'ект-суб'ектныя, ў якіх вызначальная роля адводзіцца актыўнай творчай асобе, на якую, апроч усяго іншага, ўздзейнічаюць прыродна-тэрытарыяльныя і этнічныя асаблівасці.

Кожны настаўнік, як ніякі іншы спецыяліст, абавязаны мець грунтоўную гуманітарную падрыхтоўку. Без гэтага самапедагагічная адукацыя бедзе непаўнацэннай. Практыка падрыхтоўкі ў Мазырскім педінстытуце настаўнікаў абслуговай працы з дадатковай спецыялізацыяй "фізіка" істотна ўскладняла вырашэнне гэтай задачы. Значная колькасць профільных дысцыплін прыродазнаўчага цыклу непасрэдна перашкаджае гуманітарызацыі зместу адукацыі. На сучасны момант у інстытуце гэтая праблема будзе вырашацца праз узмацненне педагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў. З новага навучальнага года замест спецыялізацыі "фізіка" уводзіцца "сацыяльная педагогіка".

Істотным складаемым павышэння ўзроўню прафесіянальнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў абслуговай працы з'яўляюцца міжпрадметныя сувязі. Так, пры вывучэнні прадметаў педагагічнага цыклу выкладчыкі імкнуцца падмацоўваць агульныя вывады і палажэнні педагагічнай навукі прыкладамі з арганізацыі навучання і выхавання на ўроках дадзенага профілю. Заняткі па асновах педагагічнага майстэрства будуюцца на факультэце ў самай цеснай сувязі з методыкамі выкладання адпаведных прадметаў. Гэткіх жа накірункаў прытрымліваюцца і пры напісанні курсавых прац па педагогіцы. Тэмы курсавых прац падбіраюцца такім чынам, каб як мага паўней выкарыстоўваліся веды, атрыманыя пры вывучэнні профільных дысцыплін. Пэўным крытэрыем і актывізатарам павышэння эфектыўнасці такіх працэсаў з'яўляюцца педагагічныя практыкі (дзве ў школе і адна ў летнім дзіцячым лагеры). Як паказвае вопыт, сістэмаўтваральны характар ўсёй педагагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў абслуговай працы дае добры плён, і інстытут у цэлым выпускае кваліфікаваных спецыялістаў.